**Білет 5**

## Практычнае заданне.
## Развіццё культуры ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Каму належала ідэя ўвекавечання памяці Хатыні і яе жыхароў?
2. Як вы думаеце, чаму серыю карцін аб жахах фашысцкіх канцлагераў Міхаіл Савіцкі назваў "Лічбы на сэрцы"?
3. Прывядзіце аргументы, якія пацвярджаюць вывад аб тым, што беларуская культура садзейнічае захаванню гістарычнай памяці беларускага народа аб Вялікай Айчыннай вайне.
4. Складзіце план адказу на пытанне: Змяненні ў сістэме адукацыі БССР у 1940-1980-ыя гг.

**I. Аб серыі карцін «Лічбы на сэрцы»** *(па матэрыялах БЕЛТА)*

| | |
|---|---|
| <br>М. Савіцкі<br>«Вязень 32815» | Міхаіл Савіцкі - беларускі жывапісец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Улетку 1942 г. патрапіў у палон. Быў вязнем фашысцкіх канцлагераў Дзюсельдорф, Дахау, Бухенвальд. Жахам канцлагераў прысвечаны 16 палотнаў Міхаіла Савіцкага пад назвай "Лічбы на сэрцы" (1974-1980).<br>М. Савіцкі так апісваў мэту серыі "Лічбы на сэрцы": "Сама атмасфера нашага стагоддзя выклікае пякучую трывогу за лёс планеты і чалавека. Кожны з нас у адказе за будучыню. Па прычыне гэтай адказнасці я не маю права маўчаць. Мне прыйшлося быць сведкам жахлівых злачынстваў. І казаць пра іх, выявіць іх сутнасць неабходна. Таму я ўзяўся пісаць серыю карцін пра фашызм "Лічбы на сэрцы", каб у абагульненых вобразах паказаць тое, чаго нельга зразумець ні са слоўных апісанняў, ні з дакументаў. Я не мог не напісаць гэтую серыю. Па-першае, у імя памяці мільёнаў ахвяр, якія загінулі ў канцлагерах. Па-другое, дзеля моладзі, якая нарадзілася пасля вайны і таксама не павінна забыць …"<br>На карціне «Вязень 32815» аўтар адлюстраваў сябе на фоне брамы канцлагера Бухенвальд. На жэтоне, падвешаным на шыі, нумар зняволенага. |

**II. З успамінаў Кірыла Трафімавіча Мазурава, першага сакратара ЦК КПБ**

У адзін з нядзельных дзён канца верасня 1964 года мы з Ціханам Якаўлевічам Кісялёвым - тады Старшынёй Савета Міністраў БССР - выехалі ў наваколле Мінска. Кіламетрах у 50 ад горада па віцебскай шашы згарнулі направа па першай, якая трапілася, дарозе. Ад'ехаўшы крыху, спыніліся ў бярозавым, працятым сонечнымі промнямі, пералеску. Прайшоўшы яго, выйшлі

на невялікую паляну… У цэнтры поля, на ўзгорку, убачылі спаленую вёску. Дзясяткі два абгарэлых печкавых труб, нібы помнікі, падымаліся да неба. Ад саміх двароў і дваровых пабудоў амаль нічога не засталося - толькі дзе-нідзе шэрыя каменныя падмуркі…

Перад намі была спаленая вёска, у якой пасля вайны так ніхто і не пасяліўся. Недалёка мы ўбачылі невялікі статак кароў. Прыглядаў за імі пажылы чалавек. Падышлі, разгаварыліся. Ад пастуха пачулі страшную гісторыю аб трагічнай гібелі вёскі Хатынь і яе жыхароў…

…Помнікаў загінуўшым вёскам на той час яшчэ не было. Узнікла думка ўвекавечыць памяць Хатыні і яе жыхароў…

Адкрыццё мемарыяльнага комплексу "Хатынь" адбылося ў дні святкавання 25-годдзя вызвалення рэспублікі ад фашысцкіх захопнікаў.

**III. Развіццё сістэмы народнай адукацыі ў БССР** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. 1917 г. - пачатак XXI ст. 9 клас").*

У пасляваенны перыяд для аднаўлення школ патрабавалася адрамантаваць ці нанава ўзвесці будынкі, наладзіць выпуск школьнага абсталявання, вучэбнай літаратуры, падрыхтаваць настаўнікаў. Рамонтам і будаўніцтвам школ займаліся не толькі будаўнікі, але і настаўнікі, бацькі вучняў і вайскоўцы. Толькі ў 1950/51 навучальным годзе колькасць школ у рэспубліцы дасягнула даваеннага ўзроўню.

Большасць дзяцей у ваенныя гады не наведвалі школу і сталі пераросткамі. Таму ў пачатковыя школы прымалі падлеткаў да 15-гадовага ўзросту, а ў першы і другі класы - 11-гадовых. Да сярэдзіны 1950-х гг. быў у асноўным завершаны пераход да ўсеагульнага сямігадовага навучання. Вялікім дасягненнем стала ўвядзенне з 1958 г. абавязковай 8-гадовай адукацыі.

Выпускнікі 8-х класаў працягвалі вучобу для атрымання сярэдняй адукацыі ў 10-гадовай школе, якая ў першай палове 1970-х гг. стала ўсеагульнай. Былі створаны сярэднія агульнаадукацыйныя школы, працоўныя політэхнічныя школы з вытворчым навучаннем, а таксама прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, якія рыхтавалі кваліфікаваных працоўных. У развіцці адукацыі галоўным лічыўся ўсеагульны ахоп моладзі вучобай і атрыманне ёю атэстата сталасці.

У першыя пасляваенныя гады паспяхова працавалі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, беларускія політэхнічны інстытут і інстытут народнай гаспадаркі, мінскія педагагічны інстытут замежных моў і медыцынскі інстытут. У першай палове 1950-х гг. былі адкрыты Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарта ў Гомелі, Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі ў Мінску. Каб падрыхтаваць спецыялістаў для новых галін прамысловасці, у БССР былі адкрыты Магілёўскі машынабудаўнічы і Мінскі радыетэхнічны інстытуты. Пачалі працаваць Брэсцкі, Мазырскі і Полацкі педагагічныя інстытуты.